**Нікіціна, Л.** «Афганцы» з вёскі Заронава / Л. Нікіціна // Афганистан. Три десятилетия спустя… – Новополоцк : О. В. Молодечкин, 2020. – С. 248–251.

## «АФГАНЦЫ» З ВЁСКІ ЗАРОНАВА



Васьмідзесятыя гады дваццатага стагоддзя прайшлі з болем і слязамі для многіх матуль былой савецкай дзяржавы. Звязана гэта было з афганскай вайной, на якой ваявалі салдаты і афіцэры Савецкай арміі. Праз Афганістан прайшло за дзесяць год 620 тысяч ваеннаслужачых, загінула больш 15 тысяч, амаль 11 тысяч сталі інвалідамі.

За 25 гадоў пасля вываду войск з Афганістана шмат былых воінаў-інтэрнацыяналістаў не засталося сярод жывых... У Заронаўскім сельсавеце зараз жывуць шэсць удзельнікаў афганскай вайны. Кожны па-свойму прывыкаў да мірнага жыцця пасля вяртання на радзіму. Былі і боль, і сумненні наконт «інтэрнацыянальнага доўгу», і страты. Яшчэ і сёння хлопцы не вельмі ідуць на кантакт, каб расказаць аб сваім баявым мінулым.



*На здымку злева направа: былы старшыня Заронаўскага с/с Ярошкіна Р.М., афганец Нікітчанка В.Ф., і краязнаўца Нікіціна Л.К.*



БЛАГОДАРНОСТЬ
Уважаемый товарищ
Никитин П.А.
КОМАНДИР в/ч п/п 75531
М. П.
1983 г.

Вёскі Столбніца і Жыгалава ў Заронаўскім сельсавеце знаходзяцца па адной вуліцы. Заканчваецца адна веска, і тут жа пачынаецца другая. Але часцей называюць гэты населены пункт Жыгалава. Зараз тут зімой «жывыя» ўсяго 5 хат. Весялей летам – дачнікі павялічваюць колькасць насельніцтва. А вось гадоу 25–30 таму веска жыла, толькі школьнікаў было за трыццаць. Калі пачалася «афганская» вайна, з гэтых мясцін прызвалі трох хлопцаў: Громава Генадзя, Пацапнёва Юрыя, Нікіціна Пятра.

**Громаў Генадзь** пачаў службу на Украіне 25.10.1982 года. Вясной 1983 года ён ужо ў Ташкенце, а наступны пункт – Кабул.

З павагай успамінае Генадзь камандзіра палка Паўлава, якому было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза за выратаванне салдат. Але з болем распавядае пра загінулых сяброў і памерлых ужо тут, на Радзіме. Адзін з іх – Хаўранкоў Уладзімір з Пестуніцы. Жыў Валодзя ў Віцебску, пахаваны на радзіме.

**Нікіцін Пётр** папрасіўся дабравольцам на вайну. З восені 1981 года да чэрвеня 1983 года быў у Афганістане. Год і пяць месяцаў наклалі цяжкі адбітак у душы: шмат загінула сяброў.

**Воранаў Аляксандр** – таксама выпускнік Заронаўскай школы. Ён нарадзіўся ў вёсцы Палойнікі. Пасля сканчэння Віцебскага ГПТВ-59 яго прызвалі ў войска. «Вучэбку» праходзіў у Туркменіі. Пасля трохмесячнай падрыхтоўкі адправілі ў Кандагар. Да самага «дэмбеля» знаходзіўся на афганскай зямлі.





Разам з ім ваявала шмат беларусаў. З даўжанскім аднафамільцам (Воранаў Сяргей Цімафеевіч) прызываліся і дамоў вярталіся адным рэйсам. Перажытае не забываецца. Перастрэлка ў снах часта бачыцца. Сёння з павагай успамінае былы воін сваіх камандзіраў: ст. лейтэнанта Безіна, прапаршчыка Іргаліева, падпалкоўніка Нікалаенку. Пасля службы Аляксандр вярнуўся ў родныя мясціны, дзе стаў працаваць механізатарам. Разам з бацькам Віктарам былі лепшымі камбайнерамі на ўборцы хлеба. Прыкладам добрых адносін да працы была і мама Марыя Іванаўна, перадавая цялятніца саўгаса «Заронава».

Ажаніўся, нарадзіліся сын і дачка. Дзеці ўжо выраслі, зараз Аляксандр з жонкай Таццянай дапамагае гадаваць унука Вадзіма, які радуе сваіх родных поспехамі ў спорце. І, канешне, пажаданне Аляксандра, каб унуку не прыйшлося ваяваць нідзе і ніколі.



**Марчанка Сяргей Леанідавіч** жыве і працуе ў вёсцы Суйкава.

**Валерый Нікітчанка** два з паловай гады праслужыў у ДРА. Быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі і медалём «За баявыя паслугі».

У Музеі «Гісторыя Заронаўскага краю» створана экспазіцыя «Воіны-інтэрнацыяналісты», у якой распавядаецца пра лес нашых землякоў, якія выконвалі свой воінскі абавязак на тэрыторыі Афганістана. Да юбілейнай даты ў Заронаўскай сельскай бібліятэцы аформлена тэматычная выстава «Жывая памяць Афгана».

*Л. Нікіціна*